ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



«Раблю тое, у што веру»



У чым сакрэт прафсаюза?



Каманда на колах

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$5 238,9 млн у эквіваленце**

*склалі золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду на 1 чэрвеня. За май 2017 года золатавалютныя рэзервы павялічыліся на $130,2 млн (на 2,5%) пасля росту ў красавіку на $92,6 мільёна. Па выніках студзеня—мая прырост рэзерваў склаў $311,7 млн 6,3%). Павелічэнню золатавалютных рэзерваў у маі спрыялі паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам Беларусі аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, а таксама павелічэнне кошту манетарнага золата.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8672 | ▼ |
| Еўра | 2,1026 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0712 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
17107
9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 107 (28471)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПЕРАПРАВА, ПЕРАПРАВА...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Ваеннаслужачыя транспартных войскаў Узброеных Сіл дапамагаюць жыхарам Бешанковіцкага і Шумілінскага раёнаў перасякаць раку Дзвіну. У апошні час рака заметна абмялела, і прыходзіцца рамантаваць наведзены з пачатку навігацыі пантонны мост.**
*(Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».)*

■ Бізнес

## Гульня па правілах

**Прадпрымальнік з Радуні гатовы пашырыць вытворчасць на пустуючых плошчах**

**На ўскрайку гарадскога пасёлка Радунь, што ў Воранаўскім раёне, не адно дзесяцігоддзе пустуе былая база перасоўнай механізаванай калоны. Малады бізнесмен Андрэй МАСЕЛЬ частку памяшканняў арандуе пад вытворчасць драўніны і шынамантаж. Але большасць плошчаў так і стаяць незанятыя.**

СТАР. 4



■ Камандзіроўка па пісьме

## АД ЗМЯРКАННЯ ДА ДОСВІТКУ

### Ці будуць у вёсках уключаць ноччу ліхтары?

**У сельскай мясцовасці пачалі адключаць начное святло на вуліцах на летні перыяд. Прычына — эканомія бюджэту. Але ў саміх вяскоўцаў такія меры часам выклікаюць абурэнне. Прынамсі, да нас у рэдакцыю па гэтым пытанні звяртаюцца не ўпершыню. Вось і нядаўна — зноў пісьмо. Гэтым разам з аграгарадка Зембін Барысаўскага раёна.**

«З 1 красавіка ў нашым Зембіне (як потым высветлілася, і ў вёсках па ўсім раёне) адключылі начное асвятленне вуліц. Зроблена гэта было па рашэнні сельскага Савета дэпутатаў. Ніхто не спрачаецца: разумная эканомія не пашкодзіць ніколі, але чаму хадзіць навобмацак павінны жыхары вёскі?» — піша нам чытач Андрэй Міколінскі.

Ужо пры сустрэчы мужчына расказаў: нядаўна ў аграгарадку бяда здарылася. Нехта ўночы запускаў вялізны кітайскі ліхтарык у паветра і зачапіў ім буслінае гняздо. Гняздо згарэла, птушкі засталіся без дому, а вінаватых не апазналі: жанчына, што жыве ў доме непадалёк і стала сведкай здарэння, без святла твараў не разгледзела. (А ўявіце, што гэтак жа неапазнана хтосьці можа ўлезці ў чужы хлеў ці гараж і вынесці гаспадарскае дабро.)

Уключаных ліхтароў на вуліцах не хапае людзям працоўным. Настаўніцам прыйдзецца ў поцемках хадзіць на дзяжурства на дыскатэку, камбайнёрам — вяртацца са жніва. «Урачы нашы дзяжураць уночы дома. Адной з іх ужо пад 70. Яна жыве ў адным канцы вёскі, а бальніца знаходзіцца ў іншым. Ёй кіламетры чатыры на выклік ісці — а святла няма! Ці вось даярак у чатыры раніцы аўтобус з цэнтра аграгарадка на работу забірае. У пачатку жніўня ў гэты час цёмна будзе», — дадае Андрэй Міхайлавіч.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!